**Музейны ўрок “Ведаем. Памятаем. Ганарымся.”**

**Мэта**: фарміраванне ў падрастаючага пакалення прававой культуры і законапаслухмянасці, грамадзянскай пазіцыі, пазнанне гісторыка-культурных каранёў, фарміраванне гонару за сваю гісторыю і краіну

**Вучань 1** Мы – дзеці сучасныя, дзеці разумныя

Ніколі не забудзем падзеі тыя сумныя

Пра тых, хто ваяваў, жыццё сваё аддаў,

Радзіму нашу для патомкаў зберагаў.

**Вучань 2** На фронце мужна ваявалі,

Матуль сваіх успаміналі.

Зямля ім сілы прыдавала,

У бой вяла і поспехаў жадала.

**Вучань 3** Пра цяжкасці вайны ў кніжках мы чыталі

І шмат чаго нам ветэраны расказалі.

Пра тых людзей, каго нямо ўжо каля нас

Мы ўспамінаем ў школе і не раз.

**Вучань 4** Пра тых салдат, што перамогу атрымалі,

Фашыстаў-ворагаў усіх прагналі

Мы абяцаем сёння усім людзям

Пра тых, хто ваяваў – ніколі не забудзем!

**Уступнае слова настаўніку гісторыі**

У кожнага чалавека ў душы застаецца тая малая радзіма, тое месца, дзе ён нарадзіўся, зрабіў першыя крокі, вырас, спазнаў першае каханне. Гістарычны шлях нашай мясцовасці працяглы. За такі малы прамежак часу нельга ўсё ўспомніць. Размова пойдзе аб нашай мясцовасці ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны асабліва актуальна ў Год гістарычнай памяці. Мы ўдзячны героем, якія змаглі абараніць нашу зямлю ад нямецкай навалы, далі нам магчымасць жыць, вучыцца і працаваць пад мірным небам.

**Вучань.** Незлічонымі матэрыяльнымі стратамі, неймавернымі людскімі пакутамі, тысячамі заўчасна абарваных чалавечых жыццяў, палаючымі гарадамі і вёскамі ўвайшла ў нашу гісторыю Вялікая Айчыная вайна. Наша Каралінская зямля з першага дня вайны апынулася ў агні пажарышчаў і стала месцам жорсткіх баёў . На досвітку 22 чэрвеня фашысцкая авіяцыя разбамбіла незакончаны аэрадром каля в.Горна, дзе былі знішчаны баракі, тэхніка, загінула шмат людзей, што знаходзіліся ў тым раёне. Як успамінаюць сведкі, ніводнаму савецкаму самалёту не ўдалося падняцца ў паветра. У гэты ж дзень нямецкія самалёты нанеслі ўдар па вайсковых часцях, расквартараваных у раёне: стралковаму палку ў в. Аляксандраўшчына.

**Вучаніца.** 23 чэрвеня 1941 года жыхары в.Збляны ўбачылі, што з в. Лаўрыновічы ў іх бок рухаецца нямецкі дэсант на легкавых аўтамабілях. Каля вёскі сабраліся жанчыны, моладзь, дзеці. Пра зверствы фашыстаў насельніцтва яшчэ не ведала. Каля натоўпу немцы затрымаліся. З машыны выйшаў афіцэр і нетаропка агледзяў людзей, затрымаў свой позірк на Мікалаю Жэбраку, на белай кашулі якога зіхацеў камсамольскі значок. Фашыст дастаў пісталет і застрэліў юнака. Аднавяскоўцы з жахам глядзелі на гэта . Мікалай Жэбрак ахвяруе ўласнае жыццё дзеля камсамольскага значка.

**Вучань** Было ў салдата два полі,
поле, дзе кветкі ірваў,
бегаў з сябрамі на волі,
і поле, дзе ён ваяваў.

Ціха было і чыста
ў полі яго дзяцінства,
былі агонь і дым
на полі ратным тым.

Два полі было ў салдата.
Адно зелянела травой,
другое было ўзарата
вайной і паліта крывёй.

Было ў салдата два полі,
поле, дзе кветкі збіраў,
бегаў з сябрамі на волі,
і поле, дзе ён паміраў.

**Вучань.** 27 чэрвеня 1941 года ў баях з фашысцкімі захопнікамі ў Слонімскім раёне каля в. Клепачы Баранавіцкай вобласці загінуў старшы палітрук Аляксандр Пятровіч Яфрэмаў. Ён пахаваны ў брацкай магіле, загінуўшым воінам, у аг. Каралін. У выніку перапіскі вучняў і настаўнікаў школы з сястрой і сынам палітрука ў 80-г гг. XX стагоддзя даведаліся аб біяграфіі Яфрэмава. Нарадзіўся старшы палітрук у Расіі ў Тульскай вобласці ў в. Яшно ў сялянскай сям'і ў 1910 годзе. Да арміі працаваў на заводзе, які выпускаў зброю. У армію пайшоў у 1928 годзе, служыў 2 гады ў сапёрным батальёне, меў трохвугольнікі на гімнасцёрцы. У 1939 годзе атрымаў званне старшага палітрука, быў пераведзены служыць на мяжу з Германіяй (7 км, м. Снядова). У прадсмяротны бой ён ішоў на групу дэсанта фашыстаў і загінуў мужна за Радзіму. На гранітнай пліце брацкай магілы выбіта толькі прозвішча Яфрэмаў, іншыя біяграфічныя звесткі, нават яго імя, імя па бацьку былі не вядомы. Цяжка сказаць як загінуў старшы палітрук. Аднак Аляксандр Пятровіч здзейсніў подзвіг, рускі па нацыянальнасці, ахвяраваў жыццём, ратуючы нашу беларускую зямлю ад нямецкіх захопнікаў, набліжаючы доўгачаканы дзень Перамогі.

**Вучаніца.** Восенню 1941 г старшынёй калгаса імя Сталіна Антонам Васільевічам Карозай і яго сябрамі па рэвалюцыйнаму падполлю ў в. Пятрэвічы была створана падпольная антыфашысцкая група. Пачалі збіраць зброю, у лесе абсталявалі тайнікі , дзе захоўвалі вінтоўкі, патроны, кулямёты. У студзені 1942 года падпольшчыкі знішчылі лінію тэлефоннай сувязі нямецкага гарнізона, што знаходзіўся ў Пятрэвічах. Гэта была першая баявая аперацыя падпольнай арганізацыі. Члены арганізацыі Сяргей Галаскок, Мікалай Худзін, Аляксандр Саўчык, Іван Худзін, Антон Грышкевіч і іншыя рабілі завалы на дарогах, палілі варожыя склады, разбуралі сувязь, з'яўляліся праваднікамі партызанскіх груп, удзельнічалі ў дыверсіях на чыгунцы. Члены штаба пастаянна інфармавалі насельніцтва аб падзеях на фронце, вялі растлумачальную работу. Аб дзейнасці падпольшчыкаў даведаліся фашысты. У сакавіку 1942 года карны атрад акружыў в. Пятрэвічы. Усіх шаснаццаць, звязаўшы папарна, даставілі ў

Міжэрычы. Пачаліся дні і ночы жудасных допытаў. Кароза паспрабаваў арганізаваць уцёк. Дасталі нажоўку, але гэта зрабіць не ўдалося.

У сярэдзіне сакавіка іх павялі на расстрэл. Пагналі глухой дарогай на Клепачы. Кароза ішоў поруч з Васілём Галаскокам. І ў апошні свой шлях, яны, як і ў жыцці, ішлі рука аб руку. Калі знясілены ад пабояў Міхаіл Ксянжук упаў на ўвільготную зямлю, Кароза і Галаскок паднялі яго і падтрымалі з абодвух бакоў, пакуль той не прыйшоў у сябе. Апошнімі словамі А. В. Карозы быў зварот да сваіх сяброў: "Вышэй галовы, сябры."

**Вучаніца** На франтах вайны загінула 99 воінаў-землякоў – ураджэнцаў Каралінскага сельскага савета. 20 воінаў-землякоў прапала без вестак на франтах вайны.

**Вядучы** Нашу мясцовасць вызваляла ў 1944 годзе 3-я армія 2-га Беларускага фронту(камандуючы генерал-палкоўнік Г.Ф. Захараў). Праціўнік планаваў затрымацца ў г п.Зэльва як мага даўжэй, каб даць магчымасць сваім адступаючым часцям замацавацца ў г. Ваўкавыску, бо з яго падзеннем Чырвонай Арміі адкрыўся шлях на Беласток, да граніцы Усходняй Прусіі.

"На світанку 11 ліпеня 1944 года передавыя часці 137-й стралковай дывызіі пад камандаваннем генерал-маёра Жабрава выйшлі да ракі Зальвянкі ў раёне вёсак Лаўрыновічы, Росцевічы, Навасёлкі. 12 ліпеня раніцай, яшчэ ў прыцемках, група з 8-10 чалавек на чале з камандзірам 17-га артылерыйскага палка палкоўнікам Н.К. Саўчанкам (у групу ўваходзіў і маёр В.В. Шапавалаў), якая ўяўляла сабой перасоўны назіральны пункт палка і трэцяга дывізіёна, перамяшчалася на новы рубеж, прайшла некаторую адлегласць пешшу па шашы і збочыла на прасёлачную дарогу. Спусцілася да невялікай рачулкі, па спарахнеламу мосціку перайшла на другі бераг і паднялася на ўзвышанае месца.

Паколькі група вырывалася наперад, і неабходна было пачакаць сваіх – пяхоту і артылерыйскія падраздзяленні, якія нас падтрымлівалі, устанавіць з імі сувязь і дзейнічаць сумесна. Для гэтага перыяду вайны мы ўжо мелі дастатковы баявы вопыт, які паказваў: неабходна тэрмінова акапацца, што і

зрабілі. Сувязь з батарэяй па рацыі ўстанавіць не ўдалося (відаць, усе былі на маршы). Дакладных звестак аб размяшчэнні праціўніка не мелі. Становішча стварылася даволі крытычнае.

У гэты час нечакана “загаварыла” гармата палкавой артылерыі адной з нашых батарэй, але мясцовасць не дазваляла весці агонь прамой наводкай. Для кіравання ж агнём з закрытай пазіціі неабходна было перш за ўсё з’арыентавацца на мясцовасць і бачыць праціўніка. Стэрэатруба незадоўга да гэтага вышла са строю. У такі напружаны і адказны момант маёр Васіль Уласавіч Шапавалаў устаў са свайго акопа ля в. Каралін і пачаў карэкціраваць агонь батарэі. (дадатак 3)

У гэты момант ногі маёра Шапавалава падкасіліся і ён рухнуў на зямлю. Медыцынская дапамога не спатрэбілася гэтаму браваму чалавеку: куля трапіла прама ў сэрца. Так абарвалося жыццё аднаго з бясстрашных камандзіраў – маёра – артылерыста В.В. Шапавалава.

У школьным музеі захоўваюцца фотаздымкі маёра В.У. Шапавалава, яго жонкі і дачкі, блізкіх на магіле ў г.п. Зэльва.

**Вучань** Ім не спявалі маткі калыханкі,

Яны не чулі казак ад дзядоў,

Палохаў іх хрыплы голас танка,

Трывожыў іх журботны енкат ўдоў.

Яны не плакала бяссоннымі начамі,

Калі ад бомбаў неслі іх у склеп.

І словы першыя, якім іх навучылі,

Былі пра немца, пра вайну і хлеб.

Заціхнуць бітвы. Вораг  будзе знішчаны.

І дзеці прычакаюць таго дня,

Калі з-пад воблака  ўпадзе на папялішчы,

Як цёплы дождж, густая цішыня.

Нясмела з хат яны у поле выйдуць,

Каб першы раз спакойна у жыцці

Палюбавацца родным краявідам,

Паслухаць звон рачулкі  ў цішыні.

Пахам  лугоў, красой гаёў палюбавацца!

І усё ж іх сэрцы задрыжаць не раз:

Ім  здасца самалетам першы бусел,

Пажарам здасца першая зара.

Лагодны гром за дальняю дубравай

Напомніць  ім пра жах бамбардзіровак.

І часта, часта у чыстыя іх сны

Урывацца будуць галасы вайны.

**Віктарына**

1. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна?

2. У якой вёсцы дзейнічала антыфашысцкае падполле на тэрыторыі Каралінскага с/с?

3. Колькі нашых землякоў загінула на франтах вайны?

4. Колькі землякоў-воінаў прапала без вестак на франтах вайны?

5. Што вы ведаеце пра Шапавалава Васіля Уласавіча?

6. Што вам вядома пра Яфрэмава Аляксандра Пятровіча?

7. Калі былі вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў аг.Каралін, г.п. Зельва?

8. Калі адзначаецца Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь?

9. Калі закончылася Вялікая Айчынная вайна?

**Вучань** Ім не спявалі маткі калыханкі,

Яны не чулі казак ад дзядоў,

Палохаў іх хрыплы голас танка,

Трывожыў іх журботны енкат ўдоў.

Яны не плакалі бяссоннымі начамі,

Калі ад бомбаў неслі іх у склеп.

І словы першыя, якім іх навучылі,

Былі пра немца, пра вайну і хлеб.

Заціхнуць бітвы. Вораг будзе знішчаны.

І дзеці прычакаюць таго дня,

Калі з-пад воблака ўпадзе на папялішчы,

Як цёплы дождж, густая цішыня.

Нясмела з хат яны у поле выйдуць,

Каб першы раз спакойна у жыцці

Палюбавацца родным краявідам,

Паслухаць звон рачулкі  ў цішыні.

Пахам  лугоў, красой гаёў палюбавацца!

І усё ж іх сэрцы задрыжаць не раз:

Ім  здасца самалетам першы бусел,

Пажарам здасца першая зара.

Лагодны гром за дальняю дубравай

Напомніць  ім пра жах бамбардзіровак.

І часта, часта у чыстыя іх сны

Урывацца будуць галасы вайны.